Ганна СКАРЖЫНСКАЯ-САВІЦКАЯ

# Мішка-выхвалішка

У маляўнічым беларускім лесе жыў-быў прыгожы мядзведзік Мішка. Шубка ў яго была новая, шаўкавістая, шакаладнага колеру. Мядзведзік заўсёды быў радасны, любіў спяваць песенькі. Уяўляў, што ён самы-самы...

Аднойчы сонечным ранкам выйшаў Мішка пагуляць. На арэлях, каля свайго доміка-дупла, гушкалася вавёрачка Пуся. Яе ярка-зялёны банцік звярок заўважыў здалёк.

— Прывітанне, Пуся, прыгожы ў цябе сёння банцік, — усміхнуўся Мішка.

— Вітаю! — адказала вавёрачка.

— У цябе банцік прыгожы, а ў мяне шубка. Ні ў кога такой няма! І я такі сёння вясёлы, добры, проста цудоўны!





Мядзведзік ганарова задраў галаву і заспяваў песеньку:

*Я Мішка, я Мішка —*
*Спрытны і адважны.*
*Я Мішка, я Мішка,*
*У лесе самы важны!*
*Мая шубка новая —*
*Пухнатая, шаўковая.*
*Я мядзведзік, я — герой!*
*Пагуляйце хто са мной!*

— Мішка-выхвалішка! — усклікнула вавёрачка Пуся.

Яна стукнула хвосцікам, саскочыла з арэляў і знікла сярод дрэў.

— Хвалько, — прамовіла рысь Белара, якая адпачывала пасля палявання ў сваім гамаку, зачэпленым за тоўсты сук сасны.

— Самахвал, — пляснуў па вадзе хвастом бабёр Пузан і нырнуў пад плаціну.

— Самахвал... — задуменна паўтарыў Мішка. — Якое цікавае слова.

Раптам мядзведзік убачыў свайго сябра лосіка Ясіка і пабег да яго.

— Паглядзі, якая ў мяне шубка! Як блішчыць на сонцы! Такой ні ў кога няма! — закружыўся Мішка.

Чамусьці Ясік нічога не адказаў. Ён адвярнуўся і пабег па сцяжынцы.

Мядзведзік апусціў галаву і сумна прашаптаў:

— Чаму са мной ніхто не хоча пагуляць? Чаму ўсе адварочваюцца і ўцякаюць? Я ж такі прыгожы...

Звярок пайшоў дадому.

— Мама, хто такі самахвал? — спытаў Мішка.

— Самахвал — гэта той, хто сам сябе хваліць, вельмі сябе любіць, выстаўляе, гаворыць пра сябе нават больш, чым ёсць на самай справе.

— А-а-а, — пачухаў за вушкам мядзведзік.

— Памятай! Таго, хто выхваляецца, не любяць. З ім не хочуць сябраваць, — пазіраў на ўнука праз тоўстыя акуляры дзядуля Міхась.

— Цяпер я зразумеў, чаму ад мяне ўцякла вавёрачка Пуся, схаваўся ў балота бабёр Пузан, а рысь Белара сказала на мяне нейкае незразумелае слова. Нават мой добры сябрук лосік Ясік уцёк.

— Ну і чаму ад цябе ўсе адвярнуліся? — спытала мядзведзіца бабуля Міхаліна.

— Таму што я спяваў пра сябе песеньку, што я спрытны і адважны, што ў лесе самы важны. У мяне шубка новая, шаўковая.

— Вой, як нясціпла! — пляснула лапамі мама Міла.

— А што такое сціпла? — спытаў мядзведзік.

— Сціпла, калі звяркі не стараюцца прыцягваць да сябе ўвагу, не шукаюць карысць у чым-небудзь, не лічаць сябе важнымі і пры гэтым у іх могуць быць вялікія дасягненні.

— Сціпласць упрыгожвае! — зноў умяшаўся ў размову дзядуля Міхась.

— Сціплыя звяркі ўмеюць з павагай слухаць іншых, адносяцца да ўсіх з дабрынёй, — дадала мама Міла.

— М-м-м-ф-ф-ф! Як смачна пахне! — удыхнуў водар Мішка.

— Гэта спёкся малінавы пірог. Запрашаю ўсіх на чаяванне! — усміхнулася бабуля Міхаліна.

— Мой любімы — малінавы! Ура! — запляскаў лапкамі мядзведзік. — Вой, радавацца, напэўна, нясціпла, — апусціў ён лапкі.

— А вось радавацца якраз можна і трэба, — зірнуў на Мішку дзед Міхась.

— Радасць — вітамінчык шчасця! — усміхнулася мама Міла.

У гэты час бабуля Міхаліна паставіла пірог на стол. Калі ён астыў, парэзала яго на кавалачкі. Мама прыгатавала духмяную гарбату.

— А ты, Мішка, раскладзі на талеркі пірог, — папрасіла бабуля Міхаліна.

Мядзведзік з радасцю прыняўся за даручэнне.

— Табе, дзядуля Міхась, самы першы кавалак. Ты самы старэйшы, — паставіў талерку Мішка. — Табе, бабуля Міхаліна, другі кавалак, маме — трэці, тату пакінем чацвёрты — ён хутка вернецца з рыбалкі, а мне — пяты кавалачак, — сказаў мядзведзік і сеў за стол.

— Ты правільна падзяліў, малайчына, — пагладзіла Мішку бабуля.

Мядзведзіку вельмі хацелася сказаць, які ён разумны, але замест гэтага звярок сціпла ўсміхнуўся і сказаў:

— Дзякуй.

Мішка зразумеў, што выхваляцца і выстаўляць сябе — нясціпла.

У гэты момант дадому вярнуўся тата Міша.

— Як добра, што тата прыйшоў! Цяпер мы ўсе разам будзем піць гарбату. — запляскаў у ладкі звярок.



*Малюнкі*
*Анастасіі СЛІЖУК*